Тыдзень роднай мовы



«Тыдзень роднай мовы» праходзіў у каледже **з 20 па 24 лютага.** Весела і нечакана пачалася раніца ў дзень беларускай мовы – 21 лютага: латарэя “Цікавы слоўнік” узняла ўсім настрой і зарадзіла пазітывам. У сераду навучэнцы з захапленнем разгадвалі крыжаванкі на хуткасць. У конкурсе “Без навук як без рук” прынялі ўдзел усе групы, але пераможцаў, якія справіліся з трыма крыжаванкамі – толькі шэсць. Самыя кемлівыя, спрытныя і дасведчаныя атрымалі салодкія прызы!

У чацвер хлопцы з групы 16 прынялі ўдзел у інтэлектуальна-пазнавальнай гульне «Квітней беларуская мова». А ў пятніцу навучэнцы з задавальненнем дзяліліся сваімі любімымі словамі на беларускай мове – пакідалі стыкеры на дошцы.

Дзякуем усім удзельнікам!

Я ♥ беларускую мову































Міжнародны дзень роднай мовы!